**Юшкевіч В. С. (Мінск)**

# СУФІКСОІДНЫЯ НАЗОЎНІКІ Ў БЕЛАРУСКІХ ЛЕКСІКАГРАФІЧНЫХ ВЫДАННЯХ

Мэта дадзенага даследавання – паказаць асаблівасці апісання суфіксоідных назоўнікаў у марфемным і словаўтваральных слоўніках сучаснай беларускай мовы, звярнуць увагу на вартасці і недахопы такога апісання, а таксама прапанаваць магчымыя шляхі ўдасканалення слоўнікавых артыкулаў.

Крыніцай фактычнага матэрыялу з'явіліся наступныя выданні: "Марфемны слоўнік беларускай мовы" А.М. Бардовіча, Л.М. Шакуна; "Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы" А.М. Бардовіча, М.М. Круталевіча, А.А. Лукашанца; "Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы" А.М. Бардовіча, М.М. Круталевіча, А.А. Лукашанца.

Прадметам даследавання паслужылі назоўнікі з суфіксоідамі славянскага і іншамоўнага паходжання (усяго каля 40 кампанентаў).

На падставе праведзенага даследавання можна вылучыць наступныя праблемныя пытанні, звязаныя з лексікаграфічным апісаннем суфіксоідных назоўнікаў: 1) паўната выбаркі; 2) чляненне слова на марфемы; 3) вызначэнне спосабу словаўтварэння і словаўтваральнага сродку. Спынімся на іх падрабязней.

**Паўната выбаркі.** Істотным дасягненнем беларускай лексікаграфіі з'яўляецца ўсё большы ахоп фактычнага матэрыялу. Так, у "Марфемны слоўнік беларускай мовы" ўключана каля 75 тыс. слоў. У той жа час значная колькасць суфіксоідных назоўнікаў па-ранейшаму застаецца па-за ўвагай лексікографаў. У прыватнасці, з кампанентам *-знаўства* ў "Школьным словаўтваральным слоўніку беларускай мовы" зафіксавана толькі адна лексема *тавараразнаўства* [3, с. 441].

**Чляненне слова на марфемы.** У "Марфемным слоўніку беларускай мовы" назоўнікі з суфіксоідамі славянскага паходжання чregistered адналькава. Цяжкасці ўзнікаюць пры апісанні слоў з кампанентамі іншамоўнага паходжання. У прыватнасці, аўтары згаданага выдання адзначаюць наступнае: "Марфемнае чляненне слоў праводзіцца паводле пашыранага ў сучасным мовазнаўстве прынцыпу: тое ці іншае слова (аснова) ставіцца ў рад аднакарэнных слоў, семантычна (значэннем) звязаных паміж сабою; структурныя часткі гэтых слоў супастаўляюцца, у выніку чаго ў кожным слове выяўляецца пэўны гукавы астатак" [1, с. 3]. У адпаведнасці з гэтым прынцыпам "у запазычаных словах вылучаюцца такія марфемы (марфемоіды), як *-дром* (*аэра-дром, касма-дром, танка-дром*), *-наўт* (*аэра-наўт, касма-наўт*), *тэле-* (*тэле-граф, тэле-фон*)" [1, с. 4]. Тым не менш у гэтым слоўніку лексемы *акванаўт, аэранаўт, аўтобус, аэробус, аэрадром, саксафон, футбол* з'яўляюцца нечлянімымі, а *тралей-бус, ракет-а-дром* чляняцца на марфемы.

**Вызначэнне спосабу словаўтварэння і словаўтваральнага сродку.** У "Школьным словаўтваральным слоўніку беларускай мовы" суфіксоідныя назоўнікі (*землямер, кнігалюб, медавар, пчалавод, прававвед, справаводства, сэрцападобны* і інш.) разглядаюцца ў межах складання і яго разнавіднасцей, што цалкам абгрунтавана, паколькі такія словаўтваральныя адзінкі не ўваходзяць у школьную праграму. Напрыклад: "*сам-а-вар-∅-□ – асноваскад. + нулявы суф.*, *ад* вар/ы/-(ць) сам-ому" [3, с. 406]. Аднак, на нашу думку, у "Словаўтваральным слоўніку беларускай мовы" было б мэтазгодна звярнуць увагу на тое, што ў сучаснай беларускай мове побач з каранямі і афіксамі існуюць афіксоіды (прэфіксоіды і суфіксоіды), з дапамогай якіх утвараюцца разнастайныя паводле семантыкі матываваныя лексічныя адзінкі.

Непаслядоўна разглядаюцца назоўнікі з кампанентам *-знавец*. Так, у "Марфемным слоўніку беларускай мовы" лексемы чляняцца на морфы наступным чынам: *літарат-ур-а-зна-вец* [1, с. 299]. У "Школьным

словаўтваральным слоўніку беларускай мовы” зафіксавана, што словы *літаратуразнавец, таваразнавец* утвораны пры дапамозе суфікса *-вец-* ад адпаведных назоўнікаў (*літаратуразнаўства, таваразнаўства*) са скарачэннем утваральнай асновы [3, с. 251, 441]; лексемы *мастацтвазнавец, матэрыялазнавец, музыказнавец* пры дапамозе суфікса *-ец-* ад назоўнікаў *мастацтвазнаўства, матэрыялазнаўства, музыказнаўства* (у гэтым выпадку адбываецца скарачэнне суфікса *-ств-*) [3, с. 265, 266, 277]; у той жа час слова *прыродазнавец* утворана шляхам асноваскладання з суфіксацыяй ад словазлучэння *прыроду вызнаваць* [3, с. 373]. У “Словаўтваральным слоўніку беларускай мовы” лексемы *літаратуразнавец, мастацтвазнавец, матэрыялазнавец, музыказнавец* лічацца ўтворанымі пры дапамозе суфікса *-ец-* ад адпаведных назоўнікаў (*літаратуразнаўства, мастацтвазнаўства, матэрыялазнаўства, музыказнаўства*) са скарачэннем утваральнай асновы і чаргаваннем ў/в’ [2, с. 177, 185, 186, 192]; *прыродазнавец* утворана шляхам асноваскладання з суфіксацыяй [2, с. 284]. Пры гэтым у выпадку са словам *таваразнавец* мае месца множная матывацыя: “*таваразна-вец-(Ø) – суф., ад* таваразна/ўств/-(а); *тавар-а-зна-вец-(Ø) – асноваклад. + суф., ад* зна-(ць) тавар-(ы)” [2, с. 351] (гл. таксама табліцу 1).

*Табліца 1*

*Асаблівасці лексікаграфічнага апісання назоўнікаў з кампанентам -знавец*

| № | Слова | Слоўнік | Асаблівасці разгляду |
|---|---|---|---|
| 1. | *літаратуразнавец* | Марфемны слоўнік беларускай мовы | *літарат-ур-а-зна-вец* |
| | | Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы | *літаратуразнав-ец-Ø – суф., ад літаратуразнаў/ств/-(а), чарг.* ў/в’ |
| | | Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы | *літаратуразна-вец-□ – суф., ад літаратуразна/ўств/-а* |
| 2. | *мастацтвазнавец* | Марфемны слоўнік беларускай мовы | *маста[ц-тв]-а-зна-вец* (мастак + ств + а + зна + вец) |
| | | Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы | *мастацтвазнав-ец-Ø – суф., ад мастацтвазнаў/ств/-(а), чарг.* ў/в’ |
| | | Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы | *мастацтвазнав-ец-□ – суф., ад мастацтвазнаў/ств/-а* |
| 4. | *прыродазнавец* | Марфемны слоўнік беларускай мовы | *прырод-а-зна-вец* |
| | | Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы | *прырод-а-знав-ец-(Ø) – асноваклад. + суф., ад прырод-(у) /вы/знав/а/-(ць), чарг.* в/в’ |
| | | Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы | *прырод-а-знав-ец-□ – асноваклад. + суф., ад прырод-у /вы/знав/а/-(ць)* |
| 3. | *таваразнавец* | Марфемны слоўнік беларускай мовы | *тавар-а-зна-вец* |
| | | Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы | *таваразна-вец-(Ø) – суф., ад таваразна/ўств/-(а);*<br>*тавар-а-зна-вец-(Ø) – асноваклад. +* |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | *суф., ад зна-(ць) тавар-(ы)* |
| | | Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы | *таваразна-вец-□ – суф., ад таваразна/ўств/-а* |

Вырашыць праблему лексікаграфічнага апісання вытворных з кампанентам *-знавец* дапамагло б вылучэнне асобага суфіксоіднага спосабу словаўтварэння. У такім выпадку ўсе згаданыя назоўнікі трэба лічыць утворанымі з дапамогай суфіксоіда *-знавец* ад адпаведных асноў. Вартасці і недахопы лексікаграфічнага апісання суфіксоідных назоўнікаў адлюстраваны ў Табліцы 2.

*Табліца 2*

*Асаблівасці лексікаграфічнага апісання суфіксоідных назоўнікаў*

| № | Слоўнік | Вартасці | Недахопы |
|---|---|---|---|
| 1. | Марфемны слоўнік беларускай мовы 1989 г. | 1) вялікая колькасць слоў;<br>2) аднастайнасць пры чляненні вытворных з суфіксоідамі славянскага паходжання | неаднастайнасць пры чляненні вытворных з суфіксоідамі іншамоўнага паходжання |
| 2. | Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы 2000 г. | 1) першы слоўнік, у якім прыводзяцца звесткі пра словаўтваральную будову слова;<br>2) указваецца магчымасць множнай матывацыі суфіксоідных вытворных | 1) абмежаваная колькасць слоў;<br>2) неаднастайнасць у вызначэнні спосабу словаўтварэння аднатыпных лексем |
| 3. | Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы 2006 г. | у адпаведнасці са школьнай праграмай аналіз большасці вытворных у межах складання і яго разнавіднасцей | 1) абмежаваная колькасць слоў;<br>2) неаднастайнасць у вызначэнні спосабу словаўтварэння аднатыпных лексем |

Такім чынам, у марфемным і словаўтваральных слоўніках сучаснай беларускай мовы суфіксоідныя назоўнікі апісаны недастаткова поўна і аднастайна. Існуе шэраг праблемных пытанняў, вырашэнне якіх будзе садзейнічаць далейшаму ўдасканаленню слоўнікавых артыкулаў, што з’яўляецца надзвычай важным не толькі для даследчыкаў мовы, але і для ўсіх, хто карыстаецца гэтымі выданнямі.

**Літаратура**


1. Бардовіч, А. М. Марфемны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч, Л. М. Шакун. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1989. – 718 с.
2. Бардовіч, А. М. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч, М. М. Круталевіч, А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 413 с.

3. Бардовіч, А. М. Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч, М. М. Круталевіч, А. А. Лукашанец ; пад рэд. А. М. Бардовіча. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 512 с.